Падтрымай "Вясну" на PATREON

За мітынг 3 ліпеня Мікалая Статкевіча асудзілі да 15 сутак арышту

14.08.2017 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Мікалай Статкевіч

Як стала вядома Праваабарончаму цэнтру "Вясна", яшчэ 9 жніўня ў судзе Ленінскага раёна г. Мінска адбыўся разгляд адміністрацыйнай справы па ч. 3 арт. 23.34 КаАП у дачыненні да апазіцыйнага палітыка **Мікалая Статкевіча** за ўдзел у мірнай акцыі пратэсту 3 ліпеня.

Суддзя **Юлія Кавяка** разглядзела справу ў адсутнасць абвінавачанага, пастанову суду Мікалай Статкевіч атрымаў па пошце.

Віна палітыка па рашэнні суду пацвярджаецца паказаннямі сведкаў-міліцыянтаў **Казлова А.** і **Рыжанкова М.**, пісьмовымі матэрыяламі справы і заключаецца ў тым, што ён прыняў актыўны ўдзел у мітынгу ў складзе групы грамадзян без дазволу Мінгарвыканкама 3 ліпеня на Кастрычніцкай плошчы ў Мінску, з мэтай публічнага абмеркавання адмены ваенных вучэнняў "Захад-2017" і вызвалення палітзняволеных.

Суддзя вынесла пастанову аб прыцягненні Мікалая Статкевіча да адміністрацыйнага арышту тэрмінам **на 15 сутак**, які будзе адлічвацца ад моманту затрымання. Пакуль што палітык знаходзіцца на свабодзе.

Акрамя таго, толькі зараз стала вядома, што яшчэ 5 ліпеня суддзя **Наталля Драчова** суду Савецкага раённа г. Мінска асудзіла Мікалая Статкевіча за паўторны ўдзел у несанкцыянаваным мітынгу на "Ваенных могілках" (ч. 3 арт. 23.34 КаАП), што праходзіў 8 траўня, да **штрафу ў 50 базавых велічынь**.

Твитнуть









Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

"Я, напэўна, проста памру тут": хто з палітвязняў знаходзіцца ў асаблівай рызыцы за кратамі





АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

"Бяляцкі, прасі літасці!" У Швецыі прадставяць спектакль-чытку паводле твораў Бяляцкага і Знака

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму (дапоўнена)

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік

2023







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY